# «НАШЧАДКІ ПЕРАМОГІ»

Пад такой назвай прайшла вечарына памяці напярэдадні Дня Перамогі ў інтэрнаце № 3. У ёй прынялі ўдзел студэнты не толькі нашага інтэрната, але і інтэрнатаў № 1 і № 5. Хлопцы і дзяўчаты падрыхтавалі ўдалыя творчыя нумары, прысвечаныя ваеннай тэматыцы. Мерапрыемства вялі студэнтка 2-га курса філалагічнага факультэта Таццяна Кукуць і студэнт 1-га курса біялагічнага факультэта Дзмітрый Новікаў.

Адкрыла вечарыну памяці чацвёртакурсніца біялагічнага факультэта Кацярына Леановіч, якая выканала музычную кампазіцыю «Вальс фронтовой медсестры». Яна ж прачытала верш уласнага сачынення «Тебе письмо украдкой я писала...» і праспявала песню пад гітару «Вспомните, ребята», напоўненую глыбокім сэнсам. Уразіла ўсіх прысутных і выступленне студэнта 2-га курса факультэта матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій Віталя Лабацэвіча, які эмацыйна прачытаў верш Канстанціна Сіманава «Атака». Да творчасці гэтага паэта звярнулася і першакурсніца педагагічнага факультэта Кацярына Мугака: яна пранікнёна прачытала вядомы верш творцы «Жди меня». А студэнтка 2-га курса факультэта матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій Анжаліка Гарбуль праспявала «Sweet Dreams» гурта «Eurythmics».

Студэнт 2-га курса факультэта фізічнай культуры і спорту Іван Антоненка і студэнт 3-га курса гэтага ж факультэта Дзмітрый Шаткоўскі выканалі музычную кампазіцыю з кінафільма «Гости из будущего». Хлопцам удалося перадаць перажыванні салдат, іх думкі пра доўгачаканую перамогу, а таксама пра тое, як вярнуцца дадому. Песню гурта «Бі-2» «Полковнику никто не пишет» праспявала Надзея Радзеўская, другакурсніца філалагічнага факультэта. У яе выкананні прагучала таксама фінальная песня «Младший лейтенант» Ірыны Алегравай.

Адным словам, мерапрыемства атрымалася цёплым, душэўным. Дзякуй усім яго ўдзельнікам за адказны падыход да справы, за добра падрыхтаваныя нумары і шчырыя пачуцці.

**P.S.** Арганізавалі вечарыну памяці «Нашчадкі Перамогі» студэнтка 2-га курса філалагічнага факультэта Яўгенія Пудава, выхавальніца інтэрната № 3 Іна Аляксандраўна Суравец і студэнт 1-га курса біялагічнага факультэта Ілья Прыбыльскі.

**Ганна МЕЛЬНІКАВА,**
**студэнтка 2-га курса ФлФ.**